№9 (252)
2009

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь



Фота "НН"

Менск, 14 траўня 2009 году.

# За сьцяг, за мову...

14 траўня ў Менску была разагнаная акцыя апазіцыі, прымеркаваная да гадавіны рэферэндуму аб зьмене дзяржаўнай сімволікі і ўвядзеньні двухмоўя. Супраць людзей пад бел-чырвона-белымі сьцягамі былі кінутыя дзясяткі супрацоўнікаў АМАПу, узброеных дубінкамі.

Акцыю пад назвай Марш "За Незалежнасьць!" планавалі правесьці ў Менску актывісты арганізацыі Малады Фронт. Нагадаем, што 14 траўня 1995 году ў Беларусі быў праведзены рэферэндум, у выніку якога замест нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу і гербу "Пагоня" ўведзеныя неасавецкія дзяржаўныя сімвалы. Таксама дзяржаўнай мовай, акрамя беларускай, стала расейская. У выніку гістарычны нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг быў у Беларусі забаронены, за яго ўзьняцьце на акцыях сталі арыштоўваць. На афіцыйным узроўні аддаецца перавага расейскай мове, у той час як беларускамоўныя школы зачыняюцца, а практычна ўсе дзяржаўныя СМІ перасталі карыстацца роднай мовай.

У знак пратэсту супраць такой палітыкі ўладаў у чарговую гадавіну рэферэндуму на Кастрычніцкую плошчу Менску выйшлі актывісты арганізацыі Малады Фронт і грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь".

Напярэдадні акцыі праходзілі затрыманьні дэмакратычных актывістаў у рэгіёнах, якія зьбіраліся ехаць у Менск. Арыштоўвалі апазіцыянераў і непасрэдна перад акцыяй, супрацоўнікі міліцыі дзяжурылі каля дамоў шмат якіх дэмакратаў.

Перад пачаткам акцыі, у 18.00, на Кастрычніцкай плошчы ўжо знаходзіліся дзясяткі супрацоўнікаў АМАПу ў форме і ў цывільным. Шмат у каго, хто ішоў у гэты час на плошчу, правяралі пашпарты.

Тым ня менш, тут змаглі сабрацца каля двух дзясяткаў моладзевых актывістаў. Удзельнікі акцыі разгарнулі нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі і расьцяжку "Малады Фронт". На маладых людзей адразу ж накінуліся дзясяткі супрацоўнікаў АМАПу, узброеных дубінкамі. З ужываньнем сілы, зьбіваючы нават дзяўчат, амапаўцы сталі адцiскаць людзей з плошчы. Адну з актывістак міліцыянт схапіў за валасы і працягнуў па асфальце. Падчас разгону амапаўцы з азьвярэньнем вырывалі з рук апазіцыянераў сьцягі, ламаючы праз калена тронкі.

(Працяг на стар. 4)



Фота "НН"

## Свабоды слова менш, чым у Зімбабве...

Ужо шмат гадоў Беларусь знаходзіцца ў катэгорыі несвабодных краінаў, такіх, дзе, паводле ацэнак "Freedom House", свабодныя медыі ці адсутнічаюць увогуле, ці прысутныя ў вельмі нязначнай колькасьці.

Кіраўнік "Freedom House" Крыстафер Уолкер гаворыць: "Мы не назіралі істотных зьменаў, якія б палепшылі сітуацыю са свабодай слова ў краіне. Фактычна за апошнія пяць гадоў, калі назіраць за сітуацыяй у гэтым рэгіёне, Беларусь – адна з тых краінаў, дзе найбольшае паніжэньне свабоды слова і вельмі, вельмі непрыветны асяродак для свабоды СМІ".

У справаздачы "Freedom House" дасьледаваная сітуацыя ў 195 краінах сьвету. 64 з іх маюць статус несвабодных паводле індэксу свабоды слова. У васьмёрку з самымі нізкімі адзнакамі трапілі Беларусь (188), Узьбекістан (189), Куба (190), Эрытрэя (191), Лівія (192), М'янма (193), Туркменістан (194) і Паўночная Карэя (195), якая замыкае сьпіс. Вышэйшую за Беларусь ацэнку атрымалі Экватарыяльная Гвінея (187), Зімбабве (186), Іран (182) ды іншыя краіны.

Першае месца ў сьвеце паводле рэйтынгу свабоды слова займае Ісландыя, за ёй ідуць Фінляндыя і Нарвегія. Суседняя з Беларусьсю Літва знаходзіцца на 18-м, Латвія на 23-м, Польшча на 24 месцы, у гэтых краінах медыі прызнаныя свабоднымі, суседняя Украіна – на 55-м месцы – у катэгорыі часткова свабодных. Расія, як і Беларусь, мае статус несвабоднай паводле Індэксу свабоды слова і знаходзіцца на 174 месцы. Дарэчы, у 2003 г. Расія яшчэ была ў сьпісе "часткова свабодных", з таго часу назіраецца паніжэньне яе рэйтынгу.

Намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец ня лічыць высновы "Freedom House" нечаканымі, бо Беларусь штогод трапляе пад крытыку міжнародных праваабарончых арганізацыяў: "Нават тыя крокі, якія былі зроблены пры канцы мінулага году – гэта вяртаньне ў сістэму распаўсюду выданьняў "Народнай волі" і "Нашай нівы" і некаторыя пазітыўныя моманты, зьвязаныя з ужываньнем новага Закону аб СМІ, – хутчэй сьведчаць пра нейкія паказальныя моманты, а не пра сістэмныя захады, якія насамрэч могуць зьмяніць сітуацыю. І калі мы пачытаем рэкамендацыі Еўрапейскага парламенту Беларусі ў галіне сродкаў масавай інфармацыі, мы пабачым, што ніводная з рэкамендацыяў не выконваецца."

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# "Адкрытая палітычная шызафрэнія"

## 30 удзельнікаў "ланцугу памяці" затрыманыя ў Менску


Фота svaboda.org
Менск, 7 траўня 2009 году.

7 траўня ў Менску прайшла акцыя, прысьвечаная памяці Юрыя Захаранкі. Перад пачаткам акцыі быў затрыманы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. Сваё затрыманьне ён назваў "адкрытай палітычнай шызафрэніяй".

У акцыі, якая праходзіла на Кастрычніцкай плошчы з 18.00 да 18.35, удзельнічала каля 150 чалавек, у тым ліку апазіцыйныя палітыкі Мікалай Статкевіч, Вінцук Вячорка, Андрэй Саньнікаў, Дзмітры Бандарэнка, Артур Фінькевіч, Сяргей Скрабец.

Акцыя была прысьвечаная памяці былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, які прапаў бяз вестак 7 траўня 1999 году. Яе ўдзельнікі сталі ланцужком уздоўж прасьпекту Незалежнасьці з бел-чырвона-белымі сьцягамі, партрэтамі Ю. Захаранкі і затрыманага прадпрымальніка з Ваўкавыску Мікалая Аўтуховіча, які знаходзіцца ў сьледчым ізалятары па вуліцы Валадарскага і абвясьціў галадоўку пратэсту. Удзельнікі акцыі скандавалі лозунгі "Жыве Беларусь!", "Свабода!", "Свабоду палітвязьням!".

Насупраць іх, таксама ланцугом, сталі байцы міліцэйскага сьпецназу. Яны не давалі ўдзельнікам акцыі набліжацца да прыдарожнай часткі. Паводле ўдакладненых зьвестак, у Менску затрымана каля 30 удзельнікаў акцыі з нагоды 10-годзьдзя зьнікненьня Юрыя Захаранкі, што прайшла вечарам 7 траўня на Кастрычніцкай плошчы. Сярод затрыманых – Анатоль Лябедзька, Аляксей Сенчыла, Максім Сяргіец, Раман Багдановіч і Сяргей Казакоў, сябры Моладзі БНФ Сяржук Семянюк, Ірына Сьмяян-Семянюк і Антось Койпіш.

"Затрыманыя былі дастаўленыя ў Цэнтральны РУУС. Потым іх адпускалі без складаньня пратаколаў", – паведаміла намесьнік старшыні Маладога Фронту Наста Палажанка. Паводле яе словаў, некаторыя актывісты згаджаюцца падпісаць паперу, дзе іх папярэджваюць аб незаконнасьці ўдзелу ў несанкцыянаваных акцыях. Тыя, каго няма ў дактыласкапічнай базе МУС, робяць адбіткі пальцаў.

# Малады Фронт – за "Школу для ўсіх"

5 траўня на цэнтральную плошчу Салігорску выйшлі маладафронтаўцы з расьцяжкай "Школа для ўсіх". Падчас пікету маладзёны распаўсюджвалі ўлёткі, прысьвечаныя незаконнаму выключэньню Івана Шылы са школы і гвалтоўнаму прызыву яго ў войска. Праз 20 хвілінаў на плошчу прыехалі дзьве машыны міліцыянтаў, якія затрымалі чатырох удзельнікаў – Хрысьціну Самойлаву, Глеба Снорніна, Ільлю Нагорнага, Насту Хадакоўскую, а таксама Ільлю Шыла, які рабіў фотарэпартаж з акцыі. У міліцыі на маладзёнаў былі складзены пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні.

7 траўня ўдзельнікаў акцыі "Школа для ўсіх" наведалі супрацоўнікі міліцыі і ўручылі ім новыя павесткі ў суд. Такім чынам, судовае паседжаньне перанесена з 8 траўня на аўторак 12 траўня.

Судзіць будуць затрыманых падчас акцыі Хрысьціну Самойлаву, Глеба Снорніна і Ільлю Нагорнага. Цягам месяцу адміністрацыйнымі камісіямі райвыканкаму мусяць быць разгледжаныя справы непаўнагадовых Ільлі Шыла і Насты Хадакоўскай.



12 траўня адбыўся суд над удзельнікамі акцыі "Школа для ўсіх". Судзьдзя Бураўцоў прызнаў актывістаў вінаватымі ў парушэньні парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў. Адміністрацыйны суд Салігорску пакараў грашовымі штрафамі актывістаў арганізацыі Малады Фронт. Хрысьціну Самойлаву аштрафаваў на 20 базавых велічыняў, Глеба Самойлава – на 10, Ільлю Нагорнага – на 15 базавых велічыняў. Удзельнікі акцыі Ільля Шыла і Анастасія Хадакоўская былі адпушчаныя без складаньня пратаколу як непаўнагадовыя.

## Дайце магчымасьць скончыць вучобу!

*Забраны ў войска Іван Шыла дагэтуль ня здаў апошні школьны экзамен*

**Актывісты Маладога Фронту 5 траўня пікетавалі Міністэрства абароны. Моладзевыя актывісты дамагаюцца для свайго салігорскага паплечніка дазволу здаць апошні школьны экзамен падчас вайсковай службы.**

**У аўторак удзень пяцёра актывістаў Маладога Фронту выйшлі да будынку Міністэрства абароны ў Менску ды разгарнулі расьцяжку "Школа для ўсіх", а таксама перадалі ў прыёмную зварот на імя міністра абароны Леаніда Мальцава з чарговай просьбай прадставіць забранаму ў войска Івану Шылу магчымасьць здаць апошні школьны экзамен. Распавядае адна з удзельнікаў акцыі Настасься Лойка: "Мы чакаем, што атрымаем ад Міністэрства абароны адэкватнае рашэньне аб дазволе Івану Шылу здаць апошні экзамен, асабліва зважаючы на тое, што пісьмовы дазвол самога Міністэрства адукацыі на гэта ўжо быў атрыманы.**

**Пасьля перадачы звароту маладафронтаўцы згарнулі расьцяжку і хутка разышліся, ніхто з удзельнікаў акцыі затрыманы ня быў.**

**Нагадаем, што за сваю палітычную дзейнасьць летась Іван Шыла быў адлічаны са школы за дзень да апошняга экзамену, а сёлета ў студзені маладзёна пасьля доўгіх ваганьняў забралі на тэрміновую вайсковую службу ў лепельскую вайсковую частку.**

# Алесь БЯЛЯЦКІ:
# "...Ня трэба крывадушнічаць"

***Апошнім часам Аляксандр Лукашэнка зрабіў шэраг заяваў адносна сітуацыі з правамі чалавека ў краіне. Да прыкладу, у інтэрв'ю агенцтву "Рэйтэрс" ён сказаў, што ў адрозьненьне ад эўрапейскіх краінаў не выкарыстоўваў сьлезацечны газ і вадамёты для разгону дэманстрантаў. А падчас паездкі ў Салігорск выказаў меркаваньне, што аснова праграмы "Усходняе партнёрства" – прагматычнае супрацоўніцтва. Маўляў, "прычым тут правы чалавека да нафты і газу?" Якія мэты мае такая рыторыка кіраўніка Беларусі? Пра гэта гутарка з праваабаронцам Алесем Бяляцкім.***


Алесь БЯЛЯЦКІ.

**–** Спадар Лукашэнка хоча чытаць у праграме "Усходняга партнёрства" тое, што хоча там бачыць, – гаворыць Алесь Бяляцкі. – Але рамкі, якія зададзеныя яшчэ перад пачаткам гэтай праграмы, з якой пагадзіліся ўсе 6 краінаў, уключаюць у сябе ня толькі паляпшэньне эканамічнага супрацоўніцтва, але паляпшэньне сітуацыі з дэмакратыяй, правамі чалавека канкрэтна ў кожнай з гэтых шасьці краінаў.

Сітуацыя ў гэтых краінах даволі няроўная. Мы бачым: іх страсаюць перманентныя крызісы. І апошнія выбары ў Малдове, якія скончыліся дэманстрацыяй і арыштамі. Дэманстрацыі ў Грузіі, і супраць дэманстрантаў ужываецца сіла. І гадавой даўнасьці вялікая дэманстрацыя ў Арменіі, якая была гвалтам разагнаная. І ў нас праблемы, якія перманентна працягваюцца – я маю на ўвазе, разгоны пікетаў і рэзкае абмежаваньне мірных дэманстрацыяў, якое нічым не абгрунтаванае.

Сітуацыя з правамі чалавека ў гэтых краінах неадназначная. І таму праграма "Усходняе партнёрства" мае адну з мэтаў – паляпшэньне гэтай сітуацыі. Калі спадару Лукашэнку не падабаюцца правы чалавека ў тым выглядзе, у якім яны прапісаны ў міжнародных дакументах – няхай ён тады выйдзе з ААН, а не ўваходзіць ва "Усходняе партнёрства".

Нашая задача – дамагчыся, каб гэтая праграма не ператварылася ў чыста тэхнічны праект. Таму такая пазіцыя Еўрасаюзу, якая прапануе супрацоўніцтва і адначасова не пагаджаецца на чыста тэхнічнае супрацоўніцтва, а бачыць гэта ў комплексе, падаецца мне вельмі важнай для ўсёй Беларусі, для беларускіх грамадзянаў.

***– А як выглядае сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі на фоне астатніх краінаў, якія далучыліся да праграмы "Усходняе партнёрства"?***

– Дзесьці ў вельмі невялікай колькасьці выпадкаў лепш. І гэта датычыцца разьвіцьця інфраструктуры і нейкага агульнага сацыяльнага забесьпячэньня, эканамічнага разьвіцьця, напрыклад, параўнальна з Малдовай, Грузіяй ці Арменіяй. Але ў той жа час, з пункту гледжаньня дэмакратычных інстытутаў, Беларусь знаходзіцца ў самым хвасьце. Ну хаця б тое, што Беларусь не зьяўляецца сябрам Рады Еўропы, гаворыць само за сябе. Нават Азербайджан зьяўляецца сябрам Рады Еўропы, і зыходзячы з тых рэкамендацыяў і добраахвотных абавязкаў за апошнія пяць гадоў вельмі прагрэсуе ў плане разьвіцьця дэмакратычных інстытутаў. Можна казаць пра значны ўдзел грамадзкіх арганізацыяў у кантролі над выканаўчымі ўладамі. Колькасьць палітычных вязьняў у Азербайджане – а лік ішоў там на сотні – зараз вельмі хутка зьмяншаецца. І гэтага якраз дабіваюцца прадстаўнікі няўрадавых праваабарончых арганізацыяў.

Што датычыцца Арменіі, Грузіі, Украіны, Малдовы, то ўзровень дэмакратыі, узровень падзелу ўлады там на галаву вышэйшы. Я быў ва ўсіх гэтых краінах цягам апошніх гадоў. Пару месяцаў таму, калі там быў Лукашэнка, я быў у Арменіі. Рэальна бачна, наколькі там палітычная культура і культура грамадства вышэйшая за тое, што адбываецца ў Беларусі. Гэта ж тычыцца і сродкаў масавай інфармацыі, палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў. Калі казаць пра агульны фон, то Беларусь, насамрэч, пляцецца тут у хвасьце.

***– Дыялог Еўрасаюзу з афіцыйным Менскам у сферы правоў чалавека – а на першым этапе з міністэрствам замежных справаў Беларусі – не прадугледжвае ўдзелу грамадзянскай супольнасьці. Можна прадбачыць, як будзе ісьці гэты дыялог, калі Лукашэнка цяпер заяўляе: "Хто сёньня ў Беларусі супраць правоў чалавека?"***

– Ён непасрэдна адказны за грамадзкую, палітычную дыскрымінацыю беларускіх грамадзянаў. Крывадушнічаць ня трэба. Я параіў бы яму быць больш шчырым і з сабой, і з беларускімі грамадзянамі.

Праграма "Усходняе партнёрства" дае вельмі вялікія магчымасьці, але імі трэба яшчэ ўмець скарыстацца. "Усходняе партнёрства" для нас і цікавае тым, што прадугледжвае актыўны ўдзел прадстаўнікоў няўрадавых арганізацыяў. І я спадзяюся, што гэта дасьць магчымасьць урэшце рэшт, можа, пры ўдзеле Еўрасаюзу, сесьці за адзін стол з прадстаўнікамі беларускага ўраду. І назваць тыя праблемы адкрыта, вочы ў вочы, якія сёньня ёсьць у пытаньнях разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці, дэмакратыі і правоў чалавека.

***Паводле Радыё "Свабода".***

## Можна прагназаваць, што "Наша Вясна" ізноў ня будзе зарэгістраваная...

**Сябры ГПА "Наша Вясна", дакументы для рэгістрацыі якога ў чарговы раз пададзеныя ў Міністэрства юстыцыі, паведамляюць, што па месяцы іх працы прыходзяць запыты і тэлефанаваньні з Мінюсту. У працадаўцаў цікавяцца ўсялякай інфармацыяй, датычнай жыцьця і дзейнасьці іх супрацоўнікаў, што сталі заснавальнікамі праваабарончага аб'яднаньня.**

**Праваабаронцы разглядаюць падобныя дзеяньні Мінюсту як пошук новых, сфальсіфікаваных, прычынаў для чарговай адмовы ў рэгістрацыі. Сьведчаньне таго, што міністэрства не зьбіраецца рабіць аб'ектыўную праверку дакументаў і рэгістраваць аб'яднаньне, заснавальнікі "Нашай Вясны" бачаць і ў тым, што выканаўцам па праверцы дакументаў праваабарончага аб'яднаньня ізноў прызначаны сьпецыяліст Мінюсту Аляксандр Харытон.**

**Да таго ж 12 траўня, па БТ быў паказаны сюжэт, дзе абсалютна ілжыва і неабгрунтавана абвінавачваліся і абражаліся і арганізацыя, і праваабаронцы.**

**Як зазначае законны прадстаўнік інтарэсаў заснавальнікаў ГПА "Наша Вясна" праваабаронца Уладзімір Лабковіч, усе гэтыя факты прыводзяць да высновы, што зноўку пачалася кампанія па дыскрэдытацыі праваабаронцаў: "Можна прагназаваць, што ГПА "Наша Вясна" ізноў ня будзе зарэгістраваная. Гэтая сітуацыя зьяўляецца яскравым пацьверджаньнем таго, што ніякіх сістэмных зьменаў у Беларусі не адбываецца і ў праваабаронцаў на сёньня фактычна няма магчымасьці легальна дзейнічаць у краіне."**

# Франака Вячорку прызвалі... законна?

5 траўня Цэнтральны вайсковы суд перанёс разгляд скаргі Франака Вячоркі з-за няяўкі заяўніка зыску – кіраўніцтва вайсковай часткі вырашыла не адпускаць моладзевага актывіста ў Менск, аднак судзьдзі запатрабавалі ўсё ж зрабіць гэта 12 траўня.

Яшчэ 4 траўня кіраўніцтва вайсковай часткі ў Мазыры, дзе з лютага бягучага году праходзіць тэрміновую службу гвалтоўна прызваны лідэр Моладзі БНФ, прыняло рашэньне не адпускаць Франака ў Менск, спадзеючыся, што разгляд зыску вырашана будзе праводзіць без самога маладзёна, аднак судзьдзі пастанавілі па іншаму.

"Працэс не адбыўся, паколькі камандаваньне часткі, дзе служыць Франак, не выпусьціла яго на суд. Вайсковыя судзьдзі досыць дэмакратычна і лагодна паставіліся да ўдзельнікаў, запыталі меркаваньне адваката а таксама бацькі Франака Вінцука Вячоркі, у выніку чаго пастанавілі перанесьці працэс і абавязаць вайскоўцаў прывезьці Франака ў Менск". – кажа намесьнік старшыні Моладзі БНФ Антон Каліноўскі.

12 траўня пачаўся разгляд касацыйнай скаргі Франака Вячоркі. У вайсковым судзе Франак дамагаецца скасаваньня пастановы суда ніжэйшай інстанцыі, які прызнаў дзеяньні вайскоўцаў і вайсковых медыкаў законнымі. На суд у справе Франка Вячоркі прыйшлі сваякі і паплечнікі хлопца з моладзі БНФ. Але яшчэ большую частку слухачоў у судовай зале складалі невядомыя маладыя людзі з голенымі галовамі, якіх прывёў туды мужчына сярэдняга веку з вайсковай выпраўкай. Маладыя людзі адмаўляліся прадставіцца і адказаць, з якой яны навучальнай установы ці ведамства.

У судзе вайсковы камісар Савецкага раёну Менску Алег Загорскі паведаміў, што людзі ў цывільным, якія аддавалі ў ваенкамаце загады вайскоўцам падчас затрыманьня Франка, былі ягонымі саслужыўцамі і па-за службай папросту давалі яму нейкія парады.

Падчас службы ў войску Франак пачаў публікаваць у інтэрнэце свой вайсковы дзёньнік. З-за гэтага хлопец ужо атрымаў некалькі нарадаў і пагрозы крымінальнага перасьледу за дыскрэдытацыю войска.

Франак Вячорка лічыць, што людзі, якія аддалі вайскоўцам загад гвалтоўна забраць моладзевых актывістаў у войска, каб такім чынам ізаляваць іх ад грамадзтва, пралічыліся: "Яны хацелі ізаляваць мяне на паўтара года. У іх нешта ўсё не атрымлівалася, і цяпер яны разграбаюць. Я вяду дзёньнік у інтэрнэце, дзе апісваю сваё салдацкае жыцьцё. Ім гэта не падабаецца, таму што я апісваю бытавыя ўмовы, у якіх знаходзяцца салдаты – без усялякага фінансаваньня і магчымасьці нармальных стасункаў паміж салдатамі і афіцэрамі. Яны ўсё гэта хацелі схаваць".

Вайсковаму суду спатрэбілася адна гадзіна, каб пастанавіць, што рашэньне міжгарнізоннага суда было правільным.

"Натуральна, я не спадзяваўся, што адна з асобна ўзятых дэталяў сістэмы дасьць збой. Сістэма працуе. Гэта неабходны этап, гэта неабходная інстанцыя дзеля таго, каб зьвяртацца ў міжнародныя органы, міжнародныя структуры, да той жа Камісіі па правах чалавека ААН".



Франак ВЯЧОРКА ў судзе.

Сваякі Франка Вячоркі непакояцца за стан ягонага здароўя і будуць настойваць, каб хлопца абсьледавалі кваліфікаваныя кардыёлагі.

Франак Вячорка адразу пасьля суда зьехаў разам з намесьнікам камандзіра часткі па ідэалогіі. Той суправаджаў Франка ў Менск і мусіць адвезьці хлопца ў Мазыр. Наконт таго, што Франак два тыдні не атрымлівае недзяржаўную прэсу, адказны за ідэалогію маёр паведаміў, што пакуль не валодае інфармацыяй пра гэта.

Нагадаем: 30 студзеня Франка Вячорку затрымалі на вуліцы міліцыянты, якімі камандавалі людзі ў цывільным. Яго кінулі ў машыну і адвезьлі ў ваенкамат. Там хлопцу нанесьлі некалькі ўдараў па твары і галаве. Гэта засьведчыла судова-медычная экспертыза. Вайскоўцы назіралі за дзеяньнямі людзей у цывільным, але ня ўмешваліся. Адразу з ваенкамату Франка адвезьлі ў вайсковую частку ў Баранавічах. 7 лютага ён прыняў прысягу. Моладзевы актывіст служыць ў Мазыры.

# За сьцяг, за мову...

*(Пачатак на стар. 1)*

У знак пратэсту моладзевыя актывісты селі на зямлю, сашчапіўшы рукі. Дэманстрантаў узялі ў шчыльнае кола. Знаходзячыся ў ачапленьні, маладыя патрыёты скандавалі "Жыве Беларусь!", "Свабоду палітвязьням", а таксама сьпявалі нацыянальны




гімн "Магутны Божа". Прымянялася жорсткая фізічная сіла, супрацоўнікі АМАПу білі нагамі сядзячых удзельнікаў, зьбівалі нават дзяўчат. Людзей трымалі ў ачапленьні на працягу гадзіны. Пасьля заканчэньня акцыі супрацоўнікамі АМАПу ў цывільным быў схоплены актывіст грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Максім Вінярскі. Яго пасадзілі ў мікрааўтобус з зацемненым шклом і павезьлі ў невядомым накірунку. Пазьней стала вядома, што апазіцыянера даставілі ў Цэнтральны РУУС.

Калі людзі сталі пакідаць плошчу, адна з удзельніцаў акцыі паспрабавала замацаваць на ліхтарным слупе бел-чырвона-белы сьцяг. Да актывісткі адразу падбеглі некалькі амапаўцаў і сілаю адабралі сьцяг.

Яшчэ некалькі апазіцыянераў былі дастаўленыя ў Кастрычніцкі РУУС, у тым ліку актывіст "Еўрапейскай Беларусі" Яўген Скрабец, актывісты Маладога Фронту Павал Кур'яновіч, Валеры Мацкевіч, актывістка "Еўрапейскай Беларусі" Алеся




Якубоўская. Актывіста Маладога Фронту Аляксея Янушэўскага затрымалі на прыпынку, калі ён зьбіраўся сесьці ў аўтобус і даставілі ў Цэнтральны РУУС Менску.

Людзі ў цывільным вялі ўдзельнікаў акцыі пад канвоем да офісу Партыі БНФ на прасьпекце Машэрава. Непасрэдна ля будынку офісу былі арыштаваныя Ягор Варапаеў з Асіповічаў і Аляксандр Лазар з Магілёву. Іх даставілі ў Цэнтральны РУУС Менску, а недзе праз паўгадзіны адпусьцілі. У 20.30 усе затрыманыя былі на волі.

## Валянцін СТЭФАНОВІЧ:

# "Не зьдзіўлюся, калі справа "Arche" будзе спыненая"

7 траўня Берасьцейскі абласны суд разгледзеў касацыйную скаргу на рашэньне Маскоўскага райсуда Берасьця аб прызнаньні шэрагу публікацыяў у № 7-8 незалежнага часопіса "Arche" "экстрэмісцкімі матэрыяламі, якія падлягаюць зьнішчэньню".

Адвакат Павел Сапелка, які прадстаўляе інтарэсы часопіса ў судзе, у касацыйнай скарзе прасіў адмяніць рашэньне суду першай інстанцыі у сувязі з тым, што яно зьяўляецца неабгрунтаваным і незаконным. Паводле адваката, КДБ не прадставіла неабходныя доказы таго, што публікацыі ў выданьні зьяўляюцца экстрэмісцкімі.

Абласны суд цалкам пагадзіўся з пазіцыяй адваката і адмяніў рашэньне суда Маскоўскага раёну Берасьця, накіраваўшы туды справу на новы разгляд.

Юрыст і праваабаронца Валянцін Стэфановіч каментуе сітуацыю: "Варта адзначыць, што гэта ўжо ня першая спроба Камітэту дзяржбясьпекі прызнаць нейкія друкаваныя матэрыялы экстрэмісцкімі. Нагадаю, што ў мінулым годзе ў Гарадзенскай вобласьці такіх спробаў было некалькі. Як мне падаецца, зараз сітуацыя вельмі падобная на тую, якая была з газетай "Свабода", калі суд Іўеўскага раёну прызнаў публікацыі ў адным з нумароў выданьня, экстрэмісцкімі. А калі гэтае рашэньне было абскарджана ў касацыйным парадку, то Гарадзенскі абласны суд адмяніў папярэдняе рашэньне па фармальных працэсуальных прычынах і накіраваў справу на новы разгляд.

Між тым цалкам не зразумела, на падставе чаго Камітэт дзяржаўнай бясьпекі сам мог прыйсьці да высновы, што гэтыя матэрыялы экстрэмісцкага характару? Дзеля гэтага суд павінен прызначыць правядзеньне адпаведнай экспертызы ва ўстанове, які валодае ведамі ў гэтай галіне. Суд жа Іўеўскага раёну справу гэтую, можна сказаць, пахаваў, фармальна спаслаўшыся на тое, што заява была пададзена з парушэньнямі Грамадзянска-працэсуальнага кодэксу.

Дарэчы, такая ж сітуацыя атрымалася і з іншай справай, якая разглядалася ў адным з раённых судоў Гародні і па якой праваабаронцы "Агляд-хроніку парушэньняў правоў чалавека за 2004 год" хацелі прызнаць экстрэмісцкім.

Я мяркую, што сёньняшняе судовае рашэньне таксама не выпадковае, таму што справа "Arche" мела вялікі грамадзкі рэзананс. Дарэчы, судовае паседжаньне было закрытым, на яго нікога акрамя адваката не дапусьцілі. Ну, а ў зьвязку з тым, што ў той самы час у Празе адбываўся саміт, на які была запрошана афіцыйная дэлегацыя Беларусі, то, натуральна, ва ўладаў не было аніякіх іншых варыянтаў, як проста адмяніць першаснае рашэньне, накіраваць яго ў першую судовую інстанцыю. І я не зьдзіўлюся, а хутчэй за ўсё так і будзе, што справа "Arche" таксама будзе спыненая, бо высьветліцца, што заява пададзеная з якімі-небудзь працэсуальнымі парушэньнямі.

Не магу не адзначыць, што сама сітуацыя з Законам аб экстрэмізме ня можа нас, праваабаронцаў, не хваляваць, таму што ў самім законе фармулёўка паняцьцяў "экстрэмізм" і "экстрэмісцкія матэрыялы" даецца вельмі шырока і размыта, што дае магчымасьць разнастайных трактовак і маніпуляцыяў. Яшчэ калі толькі прынялі гэты закон, мы выказалі сваю заклапочанасьць тым, што ён можа выкарыстоўвацца ў мэтах падаўленьня дэмакратычных арганізацыяў, партыяў, а таксама незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Практыка ўжо, на жаль, паказвае, што ва ўладаў ёсьць такія памкненьні – прызнаць экстрэмісцкімі некаторыя СМІ, якія насамрэч такімі не зьяўляюцца."

# "Вольны горад" суд не падтрымаў

6 траўня ў Магілёўскім абласным судзе адбыўся разгляд касацыйнай скаргі рэдактара незалежнай крычаўскай газеты "Вольны горад" Сяргея Няроўнага і заснавальніка гэтага выданьня Уладзіміра Кудраўцава на пастанову Чавускага раённага суда ад 17 лютага.

Калегія па грамадзянскіх справах пад старшынствам намесьніка старшыні Магілёўскага абласнога суда Сьвятланы Стальмаховай з удзелам судзьдзяў Домніч і Маймусавай падтрымала рашэньне ніжэйстаячай інстанцыі аб незадавальненьні зыску "Вольнага гораду" да дзяржаўнай газеты "Ленинский клич" аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі.

Нагадаем, што нагодай для зыску паслужыла серыя фельетонаў, якія ад 2005 да 2007 году амаль штосуботы друкаваліся ў газеце Крычаўскага гарвыканкаму "Ленинский клич". Пасквілі пачалі зьяўляцца ў адказ на жорсткую крытыку "Вольным горадам" працы рэдакцыі дзяржаўнага выданьня. Паводле заяўнікаў, аўтары фельетонаў мэтанакіравана скажалі факты з дзейнасьці апазіцыйных палітыкаў, каб ачарніць іх у вачах простых людзей. Судовая справа цягнулася больш за год. Было ўстаноўлена, што гумарэскі пісалі рэдактарка "Ленинского клича" Тацяна Іўкіна, яе намесьнік Уладзімір Далецкі, а таксама карэспандэнты газеты Аляксандр Гаўрыленка і Аляксей Іваноў. Нягледзячы на вынікі лінгвістычнай экспертызы, паводле якой надрукаваныя ў дзяржвыданьні "творы" зьяўляюцца памфлетамі, што пераходзяць у пасквілі, Чавускі раённы суд адмовіў заяўнікам Сяргею Няроўнаму і Уладзіміру Кудраўцаву ў задавальнені зыску на той падставе, што падабенства паміж персанажамі "гумарэсак" і рэальнымі асобамі не ўстаноўлена.

Рэдактар недзяржаўнай маланакладнай газеты "Вольны горад" Сяргей Няроўны ўпэўнены, што гэта палітычна матываванае рашэньне і чарговы раз перамагло тэлефоннае права: "Паседжаньне доўжылася каля 2 гадзінаў. Вельмі добра падрыхтавалася і выступіла наша адвакат Кацярына Маліноўская, аднак, на жаль, вырак абласнога суда ня мог быць іншым, бо яны не прымаюць рашэньне самастойна. Зараз створаны сапраўдны прэцэдэнт, сутнасьць якога заключаецца ў тым, што, зьмяніўшы дзьве літары ў прозьвішчы чалавека, можна пісаць пра яго што заўгодна. Цяпер у "Вольным горадзе" мы падрабязна праінфармуем чытачоў пра ход судовай справы, надрукуем дакументы, выступы, каб людзі самі змаглі разабрацца."

## Беларусь – у лідэрах па кантролі за інтэрнэтам

**Паводле дасьледаваньняў прыватнай амерыканскай кампаніі "CryptoHippie", якая сьпецыялізуецца ў тэхналогіі канфідэнцыйнасьці, Беларусь займае трэцяе месца ў рэйтынгу дзяржаваў з самым моцным электронным кантролем. На першай і другой пазіцыі – адпаведна Кітай і КНДР. Чацьвёртае месца належыць Расіі.**

**Даклад грунтуецца на інфармацыі ад розных арганізацыяў, сярод якіх Цэнтр электроннай прыватнай інфармацыі (Electronic Privacy Information Center), "Рэпарцёры бяз межаў", Freedom House, Інстытут Людвіга фон Мізэса, фонд "Heritage Foundation".**

**Публікацыя дакладу "CryptoHippie" выклікала пэўны скандал у заходніх СМІ. Як вынікае з дасьледаваньня, наступныя пасьля Расіі месцы займаюць такія дэмакратычныя краіны, як Вялікабрытанія, ЗША, Францыя, Ізраіль, Нямеччына.**

**Паводле дасьледчыкаў, за электронным кантролем у розных дзяржавах стаяць самыя розныя групы. У выпадку з Кітаем, Паўднёвай Карэяй, Беларусьсю ды Расіяй незаконнае ўварваньне ў прыватную сферу грамадзянаў – справа дзяржавы. За грамадзянамі заходніх краінаў могуць незаконна сачыць розныя фінансавыя групы, а пасьля 11 верасьня 2001 г. – ведамствы па барацьбе з тэрарызмам.**

# Усе чатырнаццаць – вязьні сумленьня

## Заява міжнароднай праваабарончай арганізацыі Amnesty International

*Рыгору Аляксеевічу Васілевічу,*
*Генеральнаму Пракурору РБ*
*вул. Інтэрнацыянальная, 22*
*220050, Менск*
*Беларусь*
*Тэлефон: +375 (17) 226 43 57*
*Факс: +375 (17) 226 42 52*

### Парушэньні правоў на свабоду сходаў і самавыражэньня

Шаноўны
Генеральны Пракурор,

Я пішу вам у сувязі са справай адзінаццаці маладых людзей, якія зараз адбываюць тэрміны абмежаваньня свабоды за ўдзел у акцыі пратэсту ў Менску ў студзені 2008. Amnesty International мяркуе, што ім было вынесенае пакараньне, якое можна прыраўняць да зьняволеньня, за мірнае карыстаньне сваімі правамі на свабоду сходаў і самавыражэньня, і па гэтай прычыне лічыць іх вязьнямі сумленьня.

Чатырнаццаць чалавек падвергліся крымінальнаму перасьледу за ўдзел у дэманстрацыі, якая адбылася ў Менску ў студзені 2008 году з мэтай пратэсту супраць увядзеньня новага падатковага заканадаўства для дробных прадпрымальнікаў. Антон Койпіш і Уладзімір Сяргееў былі аштрафаваныя, а Андрэй Кім быў асуджаны да турэмнага зьняволеньня і вызвалены па амністыі ў жніўні 2008 году. Астатнія ж 11 чалавек былі асуджаныя на 1,5 – 2 гады абмежаваньня волі паводле артыкулу 342 Крымінальнага кодэксу – "удзел або арганізацыя ў дзеяньнях, што груба парушаюць грамадзкі парадак". Арцём Дубскі, Міхаіл Пашкевіч, Тацяна Цішкевіч, Павел Вінаградаў, Аляксей Бондар, Міхаіл Крываў, Алесь Стральцоў і Алесь Чарнышоў былі асуджаныя ў красавіку 2008; Міхаіл Субач і Максім Дашук былі асуджаныя ў траўні, а Аляксандр Баразенка быў асуджаны ў сьнежні 2008 году. Умовы абмежаваньня волі, выкладзеныя ў артыкуле 38 Крымінальна-Працэсуальнага кодэксу, настолькі строгія, што Amnesty International лічыць гэта формай зьняволеньня.

Несанкцыянаваная дэманстрацыя супраць увядзеньня прэзідэнцкага дэкрэту №760 аб правілах падаткаабкладаньня і найму для дробных прадпрымальнікаў адбылася 10 студзеня 2008 году. Паводле словаў удзельнікаў і юрыстаў, апытаных Amnesty International, дэманстрацыя была мірнай, і дэманстранты спрабавалі пазьбегнуць перашкодаў руху транспарту, ідучы па тратуарах, пакуль гэта было магчыма. Пасьля дэманстрацыі 22 чалавекі былі асуджаныя да 15 дзён адміністрацыйнага арышту, а адна – да 22 дзён адміністрацыйнага арышту. Паводле зьвестак, дэманстранты зьвярталіся па дазвол на правядзеньне дэманстрацыі, але не атрымалі адказу на свой запыт да дня дэманстрацыі. Тыя 11 асобаў, аб якіх ідзе гаворка, былі асуджаныя за прычыненьне матэрыяльных стратаў бізнэсу па маршруце дэманстрацыі. Адзін з юрыстаў паведаміў Amnesty International, што падчас суда многія дырэктары фірмаў, уключаючы ўсе прыватныя фірмы, адмаўлялі прычыненьне якіх-кольвек стратаў.

Я хацеў бы скарыстаць гэтую магчымасьць, каб нагадаць вам, што як краіна-ўдзельніца Міжнароднага Пакту аб Грамадзянскіх і Палітычных Правах (МПаГіПП), Беларусь мусіць абараняць права на свабоду самавыражэньня і сходаў. Паводле артыкулу 21 МПаГіПП, ня можа накладацца ніякіх абмежаваньняў на свабоду мірных сходаў "акрамя тых, якія накладаюцца па законе і якія неабходныя ў дэмакратычным грамадзтве ў інтарэсах нацыянальнай або грамадзкай бясьпекі, грамадзкага парадку, аховы грамадзкага здароўя або маралі, або абароны правоў і свабодаў іншых". Камітэт ААН па Правах Чалавека часта знаходзіў парушэньні артыкулу 21 МПаГіПП у тых выпадках, калі дзяржавы накладаюць абмежаваньні на права мірных сходаў або патрабуюць, каб дэманстранты зьвярталіся па дазвол, у прыватнасьці калі няма эфектыўнага спосабу апратэставаць адмову ў такім дазволе. Amnesty International неаднаразова рэгістравала цяжкасьці, з якімі сутыкаліся дэманстранты пры звароце па дазвол на дэманстрацыю, а таксама абмежаваньні гэтага права ў Беларусі, што арганізацыя лічыць парушэньнем права на мірны сход.

### Адсутнасьць судовага нагляду за ўмовамі выкананьня прысуду

Amnesty International занепакоеная, што, хаця прысуд аб абмежаваньні волі выносіўся судзьдзёй, але ўмовы такога абмежаваньня могуць быць зьмененыя афіцэрам міліцыі, адказным за дадзеную справу. У выніку ўзьнікае сітуацыя, калі ўмовы могуць быць адвольна зьмененыя афіцэрамі міліцыі, і зьняволеным стане вельмі цяжка выконваць умовы свайго пакараньня, але яны ня маюць права абскардзіць такія дзеяньні.

Аляксандр Баразенка, які быў асуджаны да аднаго года абмежаваньня волі, ужо атрымаў два папярэджаньні за парушэньне ўмоваў свайго пакараньня. Паводле зьвестак, ён атрымаў першае папярэджаньне, калі міліцыя нібыта прыйшла да яго дамоў у 12.30 дня 22 сакавіка і не знайшла яго дома. Ён сказаў Amnesty International што ня чуў, каб нехта стукаўся ў дзьверы, і што ніхто не спрабаваў зьвязацца з ім па мабільным тэлефоне. Назаўтра, калі ён адзначаўся ў міліцэйскім участку, у адпаведнасьці з патрабаваньнямі, яму было сказана, што ён атрымаў папярэджаньне. З гэтага часу афіцэр міліцыі, адказны за ягоную справу, запатрабаваў ад яго быць дома ў 8 вечара. Паколькі ён працуе аптовым прадаўцом садавіны і гародніны з 7.30 да 9 гадзінаў вечара, гэта павялічвае цяжкасьці выкананьня ўмоваў.

Міхаіл Пашкевіч нібыта атрымаў папярэджаньне за спазьненьне на 20 хвілінаў на шляху з працы дамоў з-за дарожных пробак у Менску. Арцём Дубскі і Максім Дашук зараз пад пагрозай перасьледу паводле Артыкулу 415 Крымінальнага кодэксу за парушэньне ўмоваў свайго пакараньня.

### Заява аб кепскім абыходжаньні

Калі Аляксандр Баразенка адзначаўся ў міліцэйскім участку 23 сакавіка, ён быў заведзены ў кабінет і, паводле нашых зьвестак, зьбіты афіцэрам міліцыі. Пасьля гэтага ён прайшоў курс лячэньня ў шпіталі ў сувязі са страсеньнем мозгу.

*Amnesty International*
*заклікае вас:*

– неадкладна і безумоўна зьняць усе абмежаваньні, накладзеныя на Арцёма Дубскага, Міхаіла Пашкевіча, Тацяну Цішкевіч, Паўла Вінаградава, Аляксея Бондара, Міхаіла Крывава, Алеся Стральцова, Алеся Чарнышова, Міхаіла Субача, Максіма Дашука і Аляксандра Баразенку;

– забясьпечыць правядзеньне хуткага, усебаковага і незалежнага расьсьледаваньня заяваў аб зьбіцьці Аляксандра Баразенкі ў міліцэйскім участку 23 сакавіка;

– расьсьледаваць дзеяньні афіцэраў міліцыі, адказных за нагляд за выкананьнем умоваў амбежаваньня волі і забясьпечыць справядлівыя і незалежныя адносіны да 11 асобаў.

Я чакаю вашага адказу, як толькі вам будзе зручна. Дасылаю копію гэтага ліста міністру ўнутраных справаў.

**Шчыра ваш,**
**Нікаля ДАКВАРС,**
**Праграмны дырэктар,**
**Еўрапейская і Цэнтральна-Азіяцкая Праграма.**

*5 траўня 2009.*

# Мікалай Аўтуховіч: "Галадоўка да перамогі"

Прадпрымальнік Алесь Макаеў, моладзевы актывіст Андрэй Кім, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, палітыкі Мікола Статкевіч, Лявон Баршчэўскі, Сяргей Скрабец, Вячаслаў Сіўчык, Міхаіл Марыніч, прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч, моладзевыя актывісты Наста Палажанка, Андрэй Цянюта, Мікола Дземідзенка, Арцём Дубскі 4 траўня абвясьцілі галадоўку. Яны патрабуюць вызваленьня Мікалая Аўтуховіча і яго таварышаў (Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі), што знаходзяцца з 8 лютага ў турме.


Фота svaboda.org

Да акцыі "Галадоўка Салідарнасьці" далучыліся апазіцыйны актывіст Сяргей Антошанкаў, а таксама грамадзкія актывісты Ігар Кісель, што жыве ў Францыі, і Алег Алкаеў з Нямеччыны. Яны галадаюць па месцы жыхарства. Такім чынам, галадоўка набыла міжнародны характар. 5 траўня, пра далучэньне да "хатняй" галадоўкі заявілі таксама грамадзкая актывістка Мар'яна Грузьдзіловіч і сябра БХД Зьміцер Бутэнка.

8 траўня Мікалай Аўтуховіч заклікаў спыніць галадоўку салідарнасьці з ім. Пра гэта паведаміў адвакат Павел Сапелка, які сустрэўся з Мікалаем Аўтуховічам ў менскім сьледчым ізалятары. Паводле словаў адваката, сам Аўтуховіч намераны працягваць галадоўку "да перамогі". "Ён яшчэ больш схуднеў, але трымаецца. На сустрэчу са мной прыйшоў сам", – паведаміў Павел Сапелка.

15 траўня удзельнікі галадоўкі салідарнасьці з Мікалаем Аўтуховічам, Юрыем Лявонавым і Уладзімірам Асіпенкам спынілі акцыю.Такое рашэньне яны прынялі пасьля звароту да іх беларускіх палітыкаў – аднаго з лідэраў незарэгістраванай партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя" Паўла Севярынца, кіраўніка Партыі БНФ Лявона Баршчэўскага, лідэра руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча, а таксама Мікалая Статкевіча і Вячаслава Сіўчыка.

Зьвяртаючыся да маладых людзей падчас прэс-канферэнцыі, якая прайшла ўвечары 15 траўня ва ўправе Партыі БНФ, палітыкі заявілі, што асноўная задача галадоўкі салідарнасьці з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі – прыцягненьне ўвагі да іх лёсу – выканана...

# Акцыі салідарнасьці – кожны дзень

*1 траўня* каля СІЗА на вуліцы Валадарскага прайшла мірная акцыя салідарнасьці з палітвязьнем Мікалаем Аўтуховічам. 50 актывістаў грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" і Маладога Фронту прышлі да сьценаў ізалятару з партрэтамі вязьняў сумленьня, расьцяжкай "Свабоду палітвязьням!", бел-чырвона-белымі і еўрапейскімі сьцягамі. Апазіцыянеры скандавалі: "Свабоду палітвязьням!" і "Жыве Беларусь!". У акцыі таксама узялі ўдзел моладзевыя лідэры, актывісты "Еўрапейскай Беларусі" Зьміцер Бародка, Яўген Афнагель, Павел Юхневіч, Максім Вінярскі і іншыя. Праз 10 хвілінаў пасьля пачатку акцыі да СІЗА пад'ехаў аўтазак, поўны супрацоўнікаў АМАПу. Дэманстрантаў узялі ў кола і паспрабавалі выцiснуць. Пры гэтым амапаўцы выхоплівалі з рук актывістаў партрэты і рвалі іх. У знак пратэсту ўдзельнікі акцыі селі на зямлю, трымаючы ў руках партрэты палітвязьняў. Удзельнікаў мірнай акцыі сталі груба выцясьняць ад будынку ізалятару. Такім чынам дэманстрантаў фактычна пад канвоем вялі да станцыі метро "Фрунзенская", сістэматычна наносячы ўдары і абражаючы.

*2 траўня* а 18-й гадзіне каля 40 актывістаў кампаніі "Еўрапейская Беларусь", Малады Фронт, "Моладзі БНФ", руху "Маладая Беларусь", сталі ў ланцуг салідарнасьці на Кастрычніцкай плошчы. Яны трымалі партрэты Мікалая Аўтуховіча і патрабавалі вызваленьня яго і іншых палітвязьняў. Сьпецназаўцы адразу выціснулі маладых людзей з Кастрычніцкай плошчы ў бок вуліцы Багдановіча, а адтуль, абкружыўшы, давялі іх уздоўж Сьвіслачы да вуліцы Арлоўскай. Па дарозе сьпецназаўцы жорстка зьбілі некалькі чалавек.

*3 траўня* ў 18.00 на Кастрычніцкую плошчу традыцыйна выйшлі актывісты грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь", Маладога Фронту, "Маладой Беларусі". Апазіцыянеры трымалі партрэты палітвязьняў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі, а таксама расьцяжкі "Свабоду палітвязьням!", нацыянальны і еўрапейскі сьцягі. Праз 5 хвілінаў на плошчы зьявіліся міліцыянты, якія праз мегафон абвесьцілі, што акцыя несанкцыянаваная, хаця існуе пастанова Вярхоўнага суда аб тым, што грамадзяне, якія стаяць на вуліцы з партрэтамі, не парушаюць Закон аб масавых мерапрыемствах. На падаўленьне акцыі былі кінутыя дзясяткі супрацоўнікаў АМАПу, якія традыцыйна ўзялі ў кола пратэстоўцаў і выціснулі з Кастрычніцкай плошчы. У адказ маладыя апазіцыянеры селі на зямлю з партрэтамі палітвязьняў. Такім чынам, у атачэньні амапаўцаў, яны праседзелі на працягу паўгадзіны. Затым маладыя людзі былі адціснутыя супрацоўнікамі міліцыі за будынак Палацу Рэспублікі.

*4 траўня* на Кастрычніцкай плошчы Менску адбылася акцыя салідарнасьці з Мікалаем Аўтуховічам. Прыкладна тры дзясяткі ўдзельнікаў акцыі салідарнасьці, трымаючы партрэты Мікалая Аўтуховіча, падышлі пад урадавую трыбуну на Кастрычніцкай плошчы. Калі да іх падышлі байцы сьпецназу, яны селі на асфальт. Яны скандавалі: "Свабоду палітвязьням!" А палове на сёмую акцыя скончылася.

*5 траўня* працягнулася акцыя ў падтрымку ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча. Народ падыходзіў купкамі па чалавек 6-10 з розных бакоў. Недзе а 18-й гадзіне людзі зьявіліся на Кастрычніцкай і селі менавіта на тым баку, дзе знаходзіцца Палац Рэспублікі. Пратэстоўцы дасталі расьцяжкі "Свабоду палітвязьням", партрэты Аўтуховіча. Усяго ўзяло ўдзел у акцыі каля 60 чалавек.

*6 траўня* зноў на Кастрычніцкую плошчу ў Менску выйшла моладзь з партрэтамі Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі. Падыходзілі маладыя людзі групамі па 5-6 чалавек, разгортвалі бел-чырвона-белыя і еўрапейскія сьцягі, расьцяжкі, партрэты палітвязьняў. Супрацоўнікі міліцыі, як заўсёды, праз мегафоны папярэджвалі, што акцыя незаконная, пагражалі маладым людзям адміністрацыйнай адказнасьцю. Моладзь выгуквала лозунгі "Свабоду палітвязьням", "Жыве Беларусь!". Апрача моладзі ў акцыі ўдзельнічалі лідэр АГП Анатоль Лябедзька, актывісты Зьміцер Бародка, Максім Вінярскі.

# Прайшло амаль дзесяць гадоў...

## Аднак пра вынікі расьсьледаваньня факту зьнікненьня Віктара Ганчара яго родным нічога не паведамляюць

Жонка выкрадзенага ў верасьні 1999 году апазіцыйнага палітыка Віктара Ганчара ўжо каторы год спрабуе атрымаць ад пракуратуры інфармацыю пра папярэднія вынікі расьсьледаваньня па справе зьнікненьня свайго мужа. Супрацоўнікі пракуратуры фактычна ігнаруюць усе звароты Зінаіды Ганчар.

На пачатку гэтага году З. Ганчар паведамляла, што атрымала з пракуратуры Менску паведамленьне пра тое, што сьледзтва па справе яе мужа падоўжана да 24 сакавіка 2009 году і яго будзе весьці сьледчы па найважнейшых справах, малодшы дарадца юстыцыі Юры Валер’евіч Вараўка. Тады жанчына зьвярнулася да новага сьледчага з просьбай аб сустрэчы: яна як пацярпелая па крымінальнай справе па факце зьнікненьня яе мужа мае права на атрыманьне апавяшчэньняў пра прыняцьце рашэньняў, якія закранаюць яе правы і інтарэсы, а таксама атрымліваць копіі гэтых рашэньняў.

"Гэта ўжо чацьвёрты сьледчы за амаль што 10 гадоў расьследаваньня і я ўжо ня ведаю, які па ліку ліст аб тым, што сьледзтва па справе майго мужа падоўжанае, – распавяла Зінаіда Ганчар. – Я ўвесь час зьдзіўляюся прыпісцы "Аб выніках расьсьледаваньня вам будзе паведамлена дадаткова". На справе ж нічога падобнага не адбываецца. Я ўвесь час дамагаюся размовы з супрацоўнікамі пракуратуры. Так, папярэднік Вараўкі Кухаронак так са мной і не сустрэўся, хаця яму неаднаразова дасылаліся лісты з просьбаю паведаміць хоць нейкую інфармацыю пра папярэднія вынікі расьсьледаваньня."

Ю. В. Вараўка адмовіўся сустрэцца, палічыўшы, што для сустрэчы няма ніякіх падставаў. Праўда, ён прапанаваў зрабіць усё афіцыйна – напісаць хадайніцтва з абгрунтаваньнем неабходнасьці сустрэчы.

Пасьля такой прапановы адвакат Павел Сапелка, які прадстаўляе інтарэсы З. Ганчар, накіраваў у Пракуратуру г. Менску адпаведнае хадайніцтва. У хадайніцтве адвакат прасіў новага сьледчага аб выдачы З. Ганчар "на падставе п.14 арт. 50 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь пастанову пра аднаўленьне і падаўжэньне тэрміну папярэдняга расьследаваньня, вынесеных сьледчымі ў перыяд папярэдняга расьследаваньня па крымінальнай справе па факце зьнікненьня яе мужа Ганчара В.І."

У адказ на хадайніцтва сьледчы Вараўка Ю.В. паведаміў, што "разгледзеўшы матэрыялы крымінальнай справы і хадайніцтва пацярпелай Ганчар З. А. і кіруючыся арт. 136, 137 КПК Рэспублікі Беларусь, пастанавіў у задавальненьні заяўленага хадайніцтва адмовіць". Сьледчы патлумачыў, што "хадайніцтва заяўлена неабгрунтавана" і "утрымлівае няслушнае тлумачэньне закону".

Адвакат Павел Сапелка, у сваю чаргу заяўляе, што дзеяньні супрацоўнікаў пракуратуры парушаюць патрабаваньні крымінальна-працэсуальнага заканадаўства.

"Я бачу ў дзеяньнях супрацоўнікаў пракуратуры ўсіх узроўняў, да якіх мы зьвярталіся, відавочныя парушэньні патрабаваньняў крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. І напраўленыя яны на тое, каб ход расьсьледаваньня крымінальнай справы па факце зьнікненьня Віктара Ганчара ня стаў зразумелым ня тое што грамадзкасьці, а нават пацярпелым," – адзначае Павел Сапелка.

Зінаіда Ганчар і яе адвакат зьбіраюцца накіраваць скаргу на дзеяньні сьледчага пракурору.

"Мы зьбіраемся прайсьці ўсю працэдуру абскарджаньня гэтага рашэньня. І адказ генпракурора стане кропкай, прынамсі, у частцы нацыянальнага абскарджаньня", – дадаў адвакат.

Нагадаем, 16 верасьня 1999 году былога віцэ-прэм’ера Віктара Ганчара і бізнэсоўца Анатоля Красоўскага выкралі невядомыя асобы. На месцы здарэньня сьледчыя пракуратуры знайшлі плямы крыві. Судмедэксьперты далі заключэньне, што гэта кроў Віктара Ганчара. Расьсьледаваньне дадзенай крымінальнай справы неаднаразова прыпынялася, нягледзячы на заявы былых службовых асобаў аб датычнасьці да справы выкраданьня апазіцыйных палітыкаў некаторых асобаў з атачэньня Аляксандра Лукашэнкі.

# ЛТП: лячэньне ці гвалт над асобай?

Праблема абмежаваньня права на свабоду і асабістую недатыкальнасьць, а таксама выкарыстаньне прымусовай працы патрапіла ў фокус асаблівай увагі беларускіх праваабаронцаў. У першую чаргу гэта зьвязана з функцыянаваньнем у Беларусі лячэбна-працоўных прафілакторыяў (ЛТП), гэткіх рудыментаў камуністычнай эпохі, у якія накіроўваюцца асобы, хворыя на алкагалізм.

Нядаўна на праваабарончым сайце "Spring96.org" зьявіўся адмысловы банер-раздзел "Праблема ЛТП у Беларусі", дзе зьмяшчаюцца як аналітычныя публікацыі па тэме так і матэрыялы, што сьведчаць аб парушэньнях правоў грамадзян, прымусова накіраваных на "лячэньне" ў ЛТП.

У аналітычным аглядзе праваабаронцаў "Сітуацыя з правамі чалавека ў 2008 годзе" ўпершыню зьявіўся разьдзел "Абмежаваньне права на свабоду і асабістую недатыкальнасьць. Выкарыстаньне прымусовай працы".

Гэты аналіз, разам з нарматыўна-заканадаўчай базай, што рэгулююць дзейнасьць ЛТП ў Беларусі, быў накіраваны на экспертызу ўплывовым міжнародным арганізацыям: у прыватнасьці, у Шведзкі Хельсінскі камітэт і Міжнародную федэрацыю правоў чалавека, якія рыхтуюць падрабязнае заключэньне аб тым, наколькі беларускае заканадаўства, што рэгулюе дзейнасьць ЛТП і механізм зьмяшчэньня грамадзянаў на прымусовае лячэньне, адпавядаюць нормам міжнароднага права і стасуюцца з прынятымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь у галіне правоў чалавека.

Выклікае цікавасьць і артыкул праваабаронцы Валянціна Стэфановіча "Баі не па правілах, альбо Барацьба з алкагалізмам па-беларуску", першы з серыі публікацыяў, прысьвечаных гэтай актуальнай апошнім часам у грамадстве тэме – тэме барацьбы з алкагалізмам.

## Затрыманьні на канцэрце "Ляпісаў"

**7 траўня затрыманьнямі скончыўся канцэрт гурту "Ляпіс Трубецкой" у Магілёве. Калі музыкі сталі выконваць кампазіцыю "Freedom Belarus", моладзь разгарнула бел-чырвона-белыя сьцягі. Тут жа, паводле маладых людзей, у залу клубу "Ліга", дзе праходзіў канцэрт, уварваліся міліцыянты і пачалі хапаць тых, хто трымаў сьцягі. Затрымлівалі і тых, хто меў на вопратцы ды заплечніках нацыянальную сімволіку – невялікія бел-чырвона-белыя сьцяжкі і "Пагоні". Агулам затрымалі каля дваццаці чалавек.**

**"Калі музыкі пачалі выконваць кампазіцыю "Freedom Belarus", я разгарнуў сьцяг. Да мяне адразу ж падбеглі амапаўцы, заламалі рукі, ударылі пад дых і зацягнулі ў машыну. Потым ў яе запіхнулі Віталя Маркава ды Аляксандра Цітова. У міліцыі на нас склалі пратакол апытаньня, копію якога нам адмовіліся даваць. Нам сказалі, што мы пастаўленыя на фота-відэаўлік", – паведаміў пасьля вызваленьня Станіслаў Сенакосаў.**

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры передруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.